гэтай формы ў бел. музыцы: А. Кузьміча з оперы «У пушчах Палесся» А.Багатырова, Машэкі з аднайм. оперы Р.Пукста, Марыны з оперы «Яснае світанне» А.Туранкова, Свеціловіча з оперы «Дзікае паляванне караля Стаха» У.Солтана. 2) Выканальніцкае абазначэнне, якое паказвае на пявучы характар спеваў або ігры.

**АРЫНЯНСКІ** Юрый Андрэевіч (27.11. 1906, Баку — 1989), беларускі акцёр і рэжысёр. Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1961). Скончыў Цэнтр. тэхнікум



Ю.А.Арынянскі.

тэатр. мастацтва ў Маскве (1928). З 1939 акцёр і рэжысёр Дзярж. рус. драм. тэатра Беларусі, рэжысёр Гродзенскага абл. драм. тэатра, з 1958 гал. рэжысёр абласных Брэсцкага (да 1962) і Гомельскага (да 1966) драм. тэатраў. Сярод роляў: Пратасаў («Дзеці сонца» М.Горкага), Мілер («Каварства і каханне» Ф.Шылера), палкоўнік Ермашоў («Брэсцкая крэпасць» К.Губарэвіча), Сярдзюк («Іркуцкая гісторыя» А.Арбузава). Лепшыя пастаноўкі вылучаліся ансамблевасцю, увагай да распрацоўкі сцэнічных характараў: «Забаўны выпадак» К.Гальдоні (1947) у Гродзенскім, «Тры сястры» А.Чэхава (1960, і роля Вяршы-ніна), «Сабака на сене» Лопэ дэ Вэгі (1962) у Брэсцкім, «Сэрца на далоні» А. паводле І.Шамякіна (1965, і аўтар інсцэніроўкі) у Гомельскім тэатрах.

**А́РЫЯ** (ад італьян. aria песня), структурна завершаная сольная вакальная кампазіцыя (нумар) у *оперы*, *араторыі* і *кантаце*, якая выконваецца ў суправаджэнні аркестра або інструмента; жанр вак. музыкі. У 18 ст. — адна з частак інструм. сюіты. Як маналог у драме А. раскрывае душэўны стан героя, абагульняе ў эмацыянальным плане пэўны этап сцэнічнага дзеяння. Звычайна ўсе гал. дзейныя асобы маюць А. (напр., у «Надзеі Дуравай» А.Багатырова ёсць 2 А. Надзеі і А. Дзяніса Давыдава; у «Дзяўчыне з Палесся» Я.Цікоцкага — А. Алесі, Апанаса, Марфачкі; у «Сівой легендзе» Дз.Смольскага — А.Рамана, Ірыны, Любкі, Кізгайлы; у «Джардана Бруна» С.Картэса — А. Джардана, Інквізітара). А. ўласцівы напеўнасць, разгорнутая шматчасткавая будова (гэта адрознівае яе ад песні і раманса); часта ёй папярэднічае *рэчытатыў*. Разнавіднасці А. — арыета, *арыёза*, каваціна і інш. Часам А. называюць самаст. вак. канцэртную п'есу (напр., А. для голасу з аркестрам «Айчына» Ю.Семянякі), інструм. п'есу пявучага характару (А. для скрыпкі з аркестрам Л.Абеліёвіча, А. з фп. сюіты Э.Тырманд, арыета для віяланчэлі і фп. В.Войціка).

**АРЫЯ́НСТВА**, рацыяналістычная, ерэтычная плынь у хрысціянстве, якая ўзнікла ў пач. 4 ст. Пачатак А. паклаў александрыйскі прэсвітэр Арый (каля 256—336), па вучэнні якога Хрыстос-Логас з'яўляецца дасканалым тварэннем Бога, Сынам Божым «не па сутнасці, а па благадаці». Вучэнне Арыя было асуджана Нікейскім саборам у 325. Аднак А. распалася на шэраг напрамкаў, карысталася падтрымкай імператараў, у 4 ст. працягвала актыўна змагацца з нікейскай дагматыкай. А. канчаткова асуджана на саборы ў Канстанцінопалі 381. Праблема А. стала актуальнай для Захаду ў сувязі з барацьбой царквы за гегемонію сярод варварскіх народаў Еўропы, на якія А. да 6—7 ст. аказвала вял. ўплыў. У 16 ст. ідэі А. адрадзіліся ў асяроддзі радыкальных рэфармацыйных плыней, у т.л. ў ВКЛ. Буйныя абшчыны арыян існавалі ў Іўі, Нясвіжы, Навагародку і інш. Значным з'яўленнем у бел. культуры 16—17 ст. сталі т.зв. арыянскія школы, у якіх на працягу 3—5 гадоў вывучалі тэалогію, творы стараж. філосафаў, гісторыкаў, паэтаў, польск., бел., грэчаскую і лац. мовы, права, логіку, рыторыку, этыку, музыку, медыцыну, арыфметыку, фізіку. У школах вучыліся дзеці не толькі арыян, але і праваслаўных і католікаў, выхоўвалася рэліг. верацярпімасць. Гл. таксама *Антытрынітарыі*.

*Літ.*: Падокшын С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990. *В.Р.Языковіч.*

**АРЭА́Л КУЛЬТУ́РНЫ** (ад лац. area плошча, прастора), геаграфічны рэгіён распаўсюджанасці пэўных лакальных культ. сістэм, тыпаў, якія надзелены падобнымі рысамі ці падзяляюць дамінуючую культ. арыентацыю. Канцэпцыя А.к. распрацавана на мяжы 19 і 20 ст. амер. этнолагамі для правядзення даследаванняў пpасторавага распаўсюджання з'яў культуры і вызначэння культ. узаемасувязей. Вывучэнне А.к. дапамагае ўстанавіць цэнтры ўзнікнення, шляхі распаўсюджання і прасторава-часавыя межы асобных культур і інш.

**АРЭА́ЛЬНАЯ ЛІНГВІ́СТЫКА**, раздзел *мовазнаўства*, які даследуе арэалы моўных з'яў, іх тыпы і ўзаемадзеянне. Асн. прынцыпы А.л. распрацаваў у 1925 італьян. лінгвіст М.Барталі, які паказаў, што ўзаемадзеянне арэалаў блізкіх ці функцыянальна тоесных з'яў можа разглядацца з пункта погляду *дыяхраніі*: адны арэалы ўяўляюць інавацыі (новыя з'явы, якія распаўсюджваюцца), інш. — *архаізмы*. Ад іх узаемнага размяшчэння залежаць т.зв. нормы арэалаў. Складаныя выпадкі прасторавага ўзаемадзеяння арэалаў моўных з'яў (адна з якіх была прычынай узнікнення другой) даследаваў бел. лінгвіст П.А.Бузук. Сучасная А.л. займаецца інтэрпрэтацыяй моўных фактаў, здабытых *лінгвістычнай геаграфіяй* і пададзеных графічна ў выглядзе большых або меншых масіваў, размешчаных асобна ці ў сувязі



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ